**10 (159)**
**кастрычнік**

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

## НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар* *Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

## ЗМЕСТ

### ДА 1150-ГОДДЗЯ ПОЛАЦКА

Алесь Жлутка — Полацк і выправы на ўсход у "Дзеях данаў" Сакса Граматыка — 3

Васіль Варонін — Полацкі і цвярскі епіскап XIII стагоддзя Сімяон: вехі біяграфіі і дзейнасці — 14

Галіна Лабоха — Кароткі нарыс гісторыі Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра ў Полацку — 19

### ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Аляксей Мартынюк — Вяліکі князь літоўскі Свідрыгайла ў слове, вобразе і гістарыяграфічнай традыцыі — 30



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ




БГПУ + 9(07)

Аляксандр КОРЗЮК

# Прымяненне практычных метадаў у навучанні гісторыі

*У матэрыяле разглядаюцца два практычныя метады навучання гісторыі. Яны спрыяюць выпрацоўцы некаторых уменняў і навыкаў — фарміруюць уменні працаваць з гістарычнымі дакументамі, параўноўваць, аналізаваць, рабіць высновы.*

Працэс навучання з'яўляецца сумеснай дзейнасцю настаўніка і вучняў, падчас якога вырашаюцца вучэбныя задачы ўрока і задачы асобаснага развіцця. Для аптымальнай рэалізацыі такіх задач настаўніку неабходна валодаць разнастайнымі метадычнымі прыёмамі і педагагічнымі навыкамі. Сучасная адукацыйная прастора прадстаўлена арыгінальнымі напрацоўкамі айчынных і замежных метадыстаў і педагогаў, якія можна прымяняць з улікам сённяшніх патрабаванняў да педагагічнага працэсу.

Адной з мэт адукацыйнага працэсу з'яўляецца стымуляванне і падтрымка пазнавальнай дзейнасці вучняў, фарміраванне патрэбы атрымліваць веды. Гэтых мэт можна дасягнуць, напрыклад, з дапамогай нагляднасці, падрыхтоўкі вучнёўскіх паведамленняў, працай з гістарычнымі крыніцамі і г.д. У шэрагу папярэдніх нумароў "Беларускага гістарычнага часопіса" ў рубрыцы "Школа маладога настаўніка" ўвазе чытачоў былі прадстаўлены артыкулы аб выкарыстанні славеснага метаду і наглядных сродкаў у навучанні гісторыі. Цяпер мы разгледзім методыку прымянення практычных метадаў у навучанні прадмета.

Сярод практычных метадаў навучання гісторыі найбольшую эфектыўнасць маюць **практыкаванні**. Гэты метад навучання прымяняецца для планамернага паўторнага выканання дзеянняў з мэтай авалодання імі або павышэння іх якасці. Без правільна арганізаваных практыкаванняў немагчыма авалодаць вучэбнымі і практычнымі ўменнямі і навыкамі. Перавага дадзенага метаду ў тым, што ён забяспечвае эфектыўнае фарміраванне ўменняў і навыкаў, а недахоп — у слабым развіцці матывацыі вучняў[1].

Адрозніваюць спецыяльныя, вытворныя і каменціраваныя практыкаванні. *Спецыяльнымі* называюцца практыкаванні, якія шматразова паўтараюцца, накіраваныя на фарміраванне вучэбных уменняў і навыкаў. Калі ў спецыяльныя практыкаванні ўводзяцца элементы раней ужытых, то яны называюцца *вытворнымі*. Такія практыкаванні

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



***КОРЗЮК Аляксандр Аляксандравіч.***
*Загадчык кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Мінску. У 1999 г. закончыў гістарычны факультэт БДПУ імя Максіма Танка, у 2003 г. — аспірантуру пры ім. Лаўрэат прэміі Мінгарвыканкама (2001 г.) і прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных вучняў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі" (2005 г.). Аўтар каля 90 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку метадычнага дапаможніка "Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII — пачатак XX ст.): метад. дапам." (Мн., 2005), вучэбна-метадычнага дапаможніка "Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе" (Мн., 2010, 2011), вучэбна-метадычнага комплексу факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)" (у сааўт. Мн., 2010).*

выкарыстоўваюцца для паўтарэння і замацавання раней набытых навыкаў. Без вытворных практыкаванняў навык хутка забываецца. *Каменціраваныя* практыкаванні актывізуюць навучальны працэс і робяць асэнсаваным выкананне вучэбных заданняў. Сутнасць іх у тым, што настаўнік і вучні каменціруюць дзеянні, якія выконваюцца. У выніку яны лепш усведамляюцца і засвойваюцца. Метад каменціраваных практыкаванняў забяспечвае высокі тэмп урока, спрыяе свядомаму, трываламу засваенню яго матэрыялу ўсімі вучнямі.

У працэсе навучання шырока выкарыстоўваюцца *вусныя практыкаванні* — лік гадоў у гісторыі, параўнанне гістарычных з'яў і падзей, аперыраванне паняццямі і г.д. Яны неабходны для развіцця культуры мовы і лагічнага мыслення, пазнавальных магчымасцей вучняў. Прызначэнне вусных практыкаванняў — авалодаць тэхнікай і культурай аповяду, лагічнага выкладання ведаў і г.д. Вусныя практыкаванні паступова ўскладняюцца ў залежнасці ад узросту і ўзроўню падрыхтаванасці вучняў. *Пісьмовыя практыкаванні* (напісанне эсэ, планаў па матэрыялу параграфа, па гістарычным дакуменце, складанне канспекта, рашэнне пазнавальных задач і г.д.) з'яўляюцца важным кампанентам навучання. Іх прызначэнне — фарміраваць, развіваць і замацоўваць неабходныя ўменні і навыкі: вылучаць галоўнае ў змесце параграфа, раскрываць змест гістарычных паняццяў, праводзіць аналіз, параўнанне і абагульненне вывучаемых падзей, рабіць высновы, выказваць і абгрунтоўваць уласны пункт гледжання. Настаўнік павінен клапаціцца аб іх дастатковай колькасці і разнастайнасці ў адпаведнасці з вучэбнымі патрабаваннямі, сфармуляванымі ў Адукацыйным стандарце вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі». Нараўне з пісьмовымі практыкаваннямі неабходна актыўна выкарыстоўваць *графічныя* — пабудова схемы, запаўненне табліцы, выкананне схематычнага малюнка.

Каб практыкаванні былі эфектыўныя, яны павінны адпавядаць шэрагу **патрабаванняў**[2]. Да іх адносяць:

- стварэнне на ўроку ўмоў для павышэння якасці вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў;
- веданне спосабаў выканання практыкаванняў;
- свядомы ўлік і кантроль умоў, у якіх яно павінна выконвацца;
- улік дасягнутых вынікаў;
- размеркаванне правядзення паўтораў практыкаванняў у часе.

Адным з распаўсюджаных практычных метадаў навучання з'яўляецца **лабараторны.** Ён заснаваны на самастойным правядзенні вучнямі даследаванняў, вопытаў, эксперыментаў і ўжываецца перш за ўсё пры вывучэнні прыродазнаўчых прадметаў. Гэты метад дазваляе прывіваць уменні і навыкі работы з абсталяваннем, забяспечвае ўмовы для фарміравання важных практычных уменняў: вымяраць і вылічаць, апрацоўваць вынікі і параўноўваць іх з вядомымі, правяраць засвоеныя і выбіраць новыя шляхі самастойных даследаванняў. Значэнне лабараторнага метаду ў навучанні гісторыі заключаецца ў тым, што ён выкарыстоўваецца для самастойнай вучэбна-пазнавальнай работы вучняў па вывучэнню новага матэрыялу ў тэксце вучэбнага дапаможніка або гістарычных дакументаў.

Адрозненне **практычнага метаду** ад лабараторнага заключаецца ў тым, што для вырашэння практычных задач вучні пераважна прымяняюць ужо атрыманыя веды, удасканальваюць уменні выкарыстоўваць тэорыю на практыцы. Гэты метад садзейнічае фарміраванню ўменняў лакалізоўваць гістарычныя падзеі ў часе і прасторы, раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі, працаваць з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі і крытычна ставіцца да іх зместу, садзейнічае вырашэнню задач кантролю і карэкцыі, стымуляванню пазнавальнай дзейнасці вучняў. Савецкі метадыст Я.Я.Голант вылучыў **пяць этапаў** *фарміравання пазнавальнай дзейнасці* вучняў на практычных занятках:

*1. Этап тэарэтычнага асэнсавання работы.* Настаўнік тлумачыць спосаб выканання пэўнага віду дзейнасці.

*2. Этап інструктажу.* Настаўнік сам дэманструе пералічаныя вышэй дзеянні з гістарычным матэрыялам.

*3. Практычны этап.* На гэтым этапе два-тры вучні выконваюць практыкаванне, а астатнія назіраюць і пад кіраўніцтвам настаўніка робяць заўвагі.

*4. Этап выканання работы вучнем.* Кожны вучань самастойна выконвае заданне. Настаўнік удзяляе ўвагу тым вучням, якія дрэнна яго выконваюць.

*5. Этап кантролю якасці выканання.* Настаўнік прымае работы вучняў і іх ацэньвае. Ён улічвае якасць выканання, колькасць затрачанага часу, хуткасць і правільнае выкананне задання.

У працэсе навучання гісторыі практычныя метады найбольш часта прымяняюцца пры правядзенні лабараторных (лабараторна-практычных) заняткаў і практыкумаў.

**Лабараторныя (лабараторна-практычныя) заняткі** — форма вучэбных заняткаў, на якіх школьнікі самастойна вывучаюць новы матэрыял па вучэбным дапаможніку або па гістарычных дакументах. Яны праводзяцца паспяхова, калі вучні здольны самастойна авалодаць новымі ведамі і спосабамі дзейнасці з вучэбным матэрыялам, настаўнік мае разнастайныя крыніцы вучэбнай інфармацыі (вучэбны дапаможнік, хрэстаматыю, кнігу для чытання, дадатковую літаратуру, Інтэрнэт-рэсурсы, аўдыёвізуальныя сродкі і г.д.) і можа выступіць у якасці арганізатара і кансультанта (на «традыцый-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ным» уроку вывучэння новага матэрыялу ён выконвае ролю галоўнага інфарматара).

Лабараторныя заняткі складаюцца з **наступных этапаў:**

1. Арганізацыйны этап. Настаўнік паведамляе тэму ўрока, разам з класам фармулюе вучэбныя задачы, знаёміць школьнікаў з тэкстамі, з якімі яны будуць працаваць, вызначае формы навучання (франтальная, групавая, парная, індывідуальная), раздае заданні і тлумачыць спосабы іх выканання.

2. Праводзіцца самастойная работа вучняў з тэкстам вучэбнага дапаможніка або дакументамі ў адпаведнасці з інструкцыямі настаўніка, які на дадзеным этапе каардынуе і кансультуе школьнікаў.

3. Ажыццяўляецца калектыўнае абмеркаванне вынікаў працы па наступных варыянтах (справаздача групы, выступленне асобнага прадстаўніка, франтальная гутарка і г.д.).

4. Падводзяцца вынікі работы: фармулююцца высновы, даецца ацэнка работы вучняў.

**Лабараторныя заняткі па тэксце вучэбнага дапаможніка** накіраваны на фарміраванне ў школьнікаў цэласнага ўяўлення аб вывучаным факце, на развіццё ўменняў аналізаваць вучэбны тэкст, параўноўваць падзеі, з'явы, даваць ім уласную ацэнку, фармуляваць высновы. У методыцы выкладання гісторыі распрацавана наступная *тыпалогія вучэбна-пазнавальных заданняў*, якія можна прапаноўваць вучням для арганізацыі самастойнай работы з вучэбным дапаможнікам[3]:

- заданні, якія дапамагаюць зразумець сэнс вучэбнай інфармацыі: выканаць тэст, скласці слоўнік паняццяў, каляндар падзей, запоўніць храналагічную ці канкрэтызуючую табліцу, падрыхтаваць просты план па вучэбным тэксце і г.д.;
- заданні на вобразную рэканструкцыю фактаў, якія вывучаюцца: скласці карцінны план вучэбнага тэксту, падрыхтаваць славесны партрэт грамадска-палітычнага дзеяча, расказаць пра падзею ад імя яе ўдзельніка і г.д.;
- заданні на аналіз вучэбнага тэксту і іншых крыніц інфармацыі: скласці разгорнуты план, пабудаваць параўнальна-абагульняючую табліцу, скласці лагічную схему, вызначыць стаўленне аўтараў да разглядаемых падзей і г.д.;
- заданні на вызначэнне і аргументацыю асабістых ацэначных меркаванняў (ці падзяляеце вы думку аўтараў падручніка аб ...; прапануйце свой варыянт разваг на дадзеную тэму ... і г.д.).

Методыка арганізацыі вучэбна-пазнавальнай работы з вучэбным дапаможнікам будзе падрабязна разгледжана ў адным з наступных выпускаў рубрыкі.

**Лабараторныя заняткі, пабудаваныя на вывучэнні гістарычных дакументаў**, спрыяюць паглыбленню і канкрэтызацыі ведаў пра важныя гістарычныя падзеі, працэсы і з'явы; фарміраванню аналітычных уменняў работы з тэкстам дакумента; разуменню адрозненняў паміж гістарычным фактам і яго інтэрпрэтацыяй; развіццю пазнавальнага інтарэсу да гісторыі і самастойных спосабаў яе вывучэння. Работа з дакументам садзейнічае больш паспяховаму засваенню вучэбных гістарычных ведаў, рэалізацыі дзейнаснага кампанента зместу гістарычнай адукацыі. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі вучэбна-пазнавальнай работы вучняў з гістарычнымі дакументамі разглядаліся намі ў жнівеньскім нумары часопіса.

Падабраць неабходныя дакументы да канкрэтнага лабараторнага ўрока настаўніку дапамагаюць хрэстаматыі. Структура і змест пераважнай большасці хрэстаматыйнай літаратуры для айчыннай сярэдняй школы ствараецца як **дакументальна-метадычны комплекс**. Такі комплекс уяўляе сабой навукова-метадычную сістэму разнастайных крыніц, пытанняў і заданняў да іх, аб'яднаных агульнай дыдактычнай мэтай і тэмай вучэбных заняткаў. Гэты комплекс уключае як тэксты гістарычных крыніц, так і комплекс рознаўзроўневых пытанняў і заданняў да іх, а таксама можа змяшчаць арыгінальны ілюстрацыйны або аўдыёвізуальны рад, які, у сваю чаргу, можа быць выкарыстаны як самастойная крыніца вучэбнай інфармацыі.

Прывядзём прыклад некалькіх дакументальна-метадычных комплексаў па гісторыі. Большасць тэкстаў прадстаўлена з усімі лінгвістычнымі асаблівасцямі арыгінала, некаторыя з іх скарочаны. Прапушчаныя месцы ў тэкстах пазначаны шматкроп'ем у квадратных дужках. Устаўкі ў тэксты, якія не з'яўляюцца часткай арыгінала, заключаны ў квадратныя дужкі.

Пасля дакументаў і матэрыялаў размешчаны пытанні і заданні для аналізу і абмеркавання. Іх выкананне разлічана на фарміраванне ў вучняў уменняў абагульняць, параўноўваць, суадносіць гістарычныя факты і падзеі, даваць ім уласную ацэнку, рабіць высновы. Для іх паспяховага выканання спатрэбяцца ўменні вызначаць у тэксце ключавыя словы, раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі, выяўляць ролю гістарычнай асобы, праводзіць доказ.

**Тэма «Утварэнне Старажытнарускай дзяржавы»**
***(Сусветная гісторыя, 6 клас)***

*Походы Святослава. Фрагмент из «Повести временных лет»*

В год 971. Пришёл Святослав в Переяславец, и затворились болгары в городе. И вышли болгары на битву против Святослава, и была сеча велика, и стали одолевать болгары. И сказал Святослав своим воинам: «Здесь нам и умереть! Постоим же мужественно, братья и дружина!» И к вечеру одолел Святослав, и взял город приступом, и послал к грекам со словами: «Хочу идти на вас и взять столицу вашу, как и этот город». И сказали греки: «Невмо-

готу нам сопротивляться вам, так возьми с нас дань на всю дружину и скажи, сколько вас, чтобы разочлись мы по числу дружинников твоих». Так говорили греки, обманывая русских, ибо греки лживы и до наших дней. И сказал им Святослав: «Нас 20 тысяч». Но прибавил 10 тысяч: ибо было русских всего 10 тысяч. И выставили греки против Святослава 100 тысяч, и не дали дани.

И пошёл Святослав на греков, и вышли те против русских. Когда же русские увидели их — сильно испугались такого множества воинов, но сказал Святослав: «Нам некуда уже деться, хотим мы или не хотим — должны сражаться. Так не посрамим земли Русской, но ляжем здесь костьми, ибо мёртвые срама не имут. Если же побежим — позор нам будет. Так не побежим же, но станем крепко, а я пойду впереди вас: если моя голова ляжет, то о своих сами позаботьтесь». И ответили воины: «Где твоя голова ляжет, там и свои головы сложим». И исполчились русские, и была жестокая сеча, и одолел Святослав, а греки бежали.

***Вопросы и задания к документу:***

1. Как называется документ, и к какому виду источников он относится? 2. В каком веке летописец записал этот рассказ? 3. Подсчитайте, сколько примерно веков и лет разделяют поход Святослава и летописный рассказ об этом историческом событии. 4. На карте определите примерное расположение города Переяславец. На территории какого государства он находился? 5. С какими народами воевал князь Святослав в 971 г.? Каковы были, по словам самого Святослава и летописца, цели этого похода? 6. Каковы были правила и обычаи ведения боевых действий, принятые при Святославе? *(Используйте слова и словосочетания: крепостные стены, осада, клятва, клич, выкуп, вызов, воинская честь и др.).* 7. Подумайте, почему князь Святослав обращается к своим воинам со словами «братья и дружина». Какие ещё части текста и каким образом свидетельствуют об отношениях князя и дружины? 8. Предположите, какие источники мог использовать летописец, рассказывая о походах Святослава. Были ли среди них византийские и болгарские документы? Своё мнение аргументируйте. 9. Как автор рассказа о Святославе относится к своему герою и русской дружине? Найдите в тексте источника характерные слова и выражения. 10. Автор учебника заявляет, что «Святослава отличали прямота, честность и скромность». Не противоречат ли этой оценке слова князя о том, что в его дружине 20 тыс. воинов? 11. Народ какого современного ему государства летописец в своём рассказе называет «греками»? 12. В тексте документа найдите слова, передающие отношение его автора к «грекам». Попробуйте объяснить, почему у летописца сложилось подобное мнение о греках. Насколько оно, на ваш взгляд, объективно и справедливо? 13. Как вы думаете, с какой целью летописец включил в своё повествование подробный рассказ о походах князя Святослава? Какие идеи он хотел донести до потомков? 14. Что нового этот документ помог вам узнать о князе Святославе и его походах, об отношениях Руси с соседними странами и народами, об источниках по древней отечественной истории?[4]

**Тэма «Усталяванне новай культуры ў эпоху Адраджэння»** *(Сусветная гісторыя, 8 клас)*

*Фрагмент из сочинения Н. Макиавелли «Государь»*

Итак, князь не должен бояться, что его ославят безжалостным, если ему надо удержать своих подданных в единстве и верности. Ведь, показав в крайности несколько устрашающих примеров, он будет милосерднее тех, кто по своей чрезмерной снисходительности допускает развиться беспорядкам, вызывающим убийства и грабежи; это обычно потрясает целую общину, а кары, налагаемые князем, падают на отдельного человека.

Ведь тот, кто хотел бы всегда исповедовать веру в добро, неминуемо погибнет среди столь многих людей, чуждых добра. Поэтому князю, желающему удержаться, необходимо научиться умению быть недобродетельным и пользоваться или не пользоваться этим.

Смотря по необходимости, князь должен быть настолько мудр, чтобы уметь избегать бесславия тех пороков, которые лишали бы его государства, других же пороков, не угрожающих его господству, он должен беречься, если это возможно; если же он не в силах это сделать, то может дать себе волю без особых колебаний.

***Вопросы и задания к документу:***

1. Как, согласно Н.Макиавелли, соотносятся мораль и политика? 2. Перечислите, какие пороки могут лишить правителя власти. 3. Используя документ, определите, какова главная цель политика. Каково вообще предназначение такой сферы общественной деятельности как политика? 4. Подумайте, возможно ли существование всецело морального политика. При ответе используйте текст документа и свои знания об общественно-политической сфере жизни общества. 5. Проанализируйте формулу Н.Макиавелли «Цель оправдывает средства». 6. Соотнесите рассуждение Н.Макиавелли с аргументами этики ненасилия[5].

**Тэма «Расія ў гады рэвалюцыйных падзей (1905–1917 гг.)»** *(Сусветная гісторыя, 9 клас)*

*Из записки Председателя Совета государственной обороны великого князя Николая Николаевича. 25 декабря 1907 г.*

Окончившаяся неудачею война с Японией с полной ясностью показала все недостатки, пробелы и ошибки, относящиеся до обороны государства [...].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Исключительно тяжёлые исторические события, которые переживает Россия, служат смягчающими вину обстоятельствами тому, что до сих пор в этом отношении так мало сделано, но они далеко не оправдывают. Все военные, и чем выше в военной иерархии, тем более, должны признать себя виновными в том, что со времени окончания истекшей войны пока так еще мало сделано для поднятия обороны государства [...].

Представленный ныне проект реорганизации армии, являясь весьма почтенным трудом, по-моему, грешит одним: в нем нет достаточной смелости.

Вся кавалерия требует полной реорганизации. Казачьи полки должны быть выделены из теперешних дивизий и соединены в казачьи дивизии [...].

Пулемётов у нас мало, и они, по баллистическому качеству и по удобству применения к местности и перевозки, далеки от совершенства. Насколько мне известно, уже имеются образцы более совершенные, чем у нас принятые.

Наша армия снабжена хорошею, выдержавшею боевое испытание полевою артиллериею, ее надо только довести до 4-х орудий на батальон. Но горная артиллерия у нас в зачатке; следует признать, что ее теперь почти нет. Еще меньше у нас гаубиц, без которых успешный современный бой вести трудно. Тяжелая армейская артиллерия должна быть создана заново. В Германии имеются при армиях подвижные осадные батареи.

Вопрос искрового телеграфа у нас в зародыше, равно и управляемые шары [...].

Автомобилям суждено сыграть немаловажную роль в будущей войне, в особенности на европейском театре [...]. Надо, изучив постановку техники этого дела за границею, применить к нам все, что только она дает пригодного для войск и для перевозки военных тяжестей.

Снаряжение наше несовершенно; опыт войны это доказал; безотлагательно все должно быть исправлено.

Необходим пересмотр и переоценка земельных ценностей военного министерства. В одном Петербурге есть много плохих казарм в центре города, занимающих громадные пространства не только без пользы для войск, но к вреду для них. Продав эти казармы, можно выстроить на другом месте новые, во всех отношениях представляющие собою последнее слово совершенства, и сделать громадные сбережения.

Вся живая сила, составляющая массу армии, должна быть одинаково обучена и воспитана. Необходимо, чтобы директива для однообразного обучения и воспитания армии была преподана и чтобы она правильно и одинаково применялась высшими начальниками, т. е. командующими войсками в округах.

Последние тяжелые годы после войны ясно показали, что самая слабая сторона нашего флота – живая сила. Во флоте одинаково, как и в сухопутной армии живая сила главное [...].

Надо помнить, что события не ждут, а мы более чем не готовы. Следовательно, энергия должна быть наивысшего напряжения и необходимость ее и труда должна быть осознана всеми участниками работы. Еще необходимое условие успеха — розни никакой, все как один, работать, помня, что мы дети одной земли и служим одному Царю.

Генерал-адъютант Николай

***Вопросы и задания к документу:***

1. Каковы, по мнению Председателя Совета государственной обороны, сильные и слабые стороны российской армии, обнаруженные в ходе русско-японской войны? 2. С помощью дополнительных источников составьте комментарии к военно-техническим терминам, использованным в тексте документа (искровой телеграф, управляемые шары и др.). 3. Военная техника и армии каких стран могли служить образцом для российской армии в начале XX века? 4. Какие качества личности и черты характера, судя по этой записке, отличали великого князя Николая Николаевича?[6].

**Тэма «Адукацыя і навука ў першай палове XIX ст.»** *(Гісторыя Беларусі, 9 клас)*

*І. М. Доўнар-Запольскі пра адукацыю ў Віленскай навучальнай акрузе*

Галоўны кірунак усёй навучальнай справе ў акрузе надаваў яе папячыцель князь Адам Чартарыйскі. Гэта быў моцны чалавек пры двары і ў той жа час асоба, якая ўсё сваё жыццё служыла справе аднаўлення Польшчы ў яе былых межах. На Заходні край і на Літву ён глядзеў вачыма палякаў і не адрозніваў іх ад сапраўднай Польшчы [...]. Увесь кірунак выкладання атрымаў яркую польскую нацыянальную афарбоўку [...].

Адпаведныя людзі з часам склалі апору паланізацыі, замацаваўшыся ў Віленскім універсітэце [...]. Ян Снядэцкі *(рэктар універсітэта.— А.К.)*, паляк паходжаннем [...], быў, бясспрэчна, буйным вучоным-астраномам. Але палітычныя і нацыянальныя мэты ў навуцы ён ставіў на першае месца. Ён быў вялікі знаўца і аматар польскай мовы, натхняў і падтрымліваў тых вучоных, якія распрацоўвалі гэтую мову [...]. Са з'яўленнем Снядэцкага ў Вільні спынілася ўсялякая апазіцыя паланізму [...]. З вялікай заклапочанасцю паставіўся Снядэцкі да замяшчэння кафедры польскай гісторыі. Ён звярнуў увагу на маладога вучонага, бо прадбачыў у ім багатыя навуковыя здольнасці і моцную кіпучую натуру, здольную аддацца пры першай магчымасці рэвалюцыйнай барацьбе супраць Расіі. Гэта быў знакаміты Іяхім Лялевель [...]. Наогул гэта быў перыяд магутнага росквіту польскай культуры ў межах нашага краю [...]. Эпоха Лялевеля [...], Снядэцкага [...] і многіх іншых ажывіла польскую



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

думку, польскую навуку і падрыхтавала эпоху Міцкевіча і Сыракомлі. Гэта эпоха вырвала з Беларусі шмат яе выдатных сыноў, якія [...] аддалі свой розум і здольнасці польскай культуры і нацыянальнасці[7].

***Пытанні і заданні да дакумента:***

1. Выкарыстоўваючы тэкст дакумента, прывядзіце факты, якія даказваюць, што першая трэць XIX ст. была перыядам росквіту польскай культуры на тэрыторыі Віленскай навучальнай акругі. Успомніце, калі і ў сувязі з чым у сістэме адукацыі на беларускіх землях адбыліся істотныя змены? 2. Як вы думаеце, чаму Я.Снядэцкі з асаблівай заклапочанасцю ставіўся да падбору загадчыка кафедры польскай гісторыі? Што вам вядома пра навуковую і грамадска-палітычную дзейнасць І.Лялевеля? 3. Як вы разумееце выраз «Эпоха Лялевеля, Снядэцкага і многіх іншых [...] падрыхтавала эпоху Міцкевіча і Сыракомлі»? 4. У чым вы бачыце станоўчыя і адмоўныя бакі развіцця адукацыі ў рамках Віленскай навучальнай акругі ў першай трэці XIX ст.

*2. М.Доўнар-Запольскі пра навуковае вывучэнне Беларусі ў першай трэці XIX ст.*

[...] Асабліва ў гэты час пасунулася вывучэнне гісторыі. Мясцовыя часопісы і штогоднікі [...] змяшчаюць шэраг гістарычных артыкулаў. З'яўляецца шмат асобных прац [...]. ...Вылучаюцца працы прафесараў права Віленскага універсітэта Іосіфа Ярашэвіча і Ігната Даніловіча. У іх працах выразна праведзена грань паміж літоўска-беларускай гісторыяй і гісторыяй Польшчы. Хоць у загалоўках іх прац яшчэ ёсць імя «Літвы», але абодва гісторыка права разумеюць гэтую назву ў сэнсе дзяржаўным, адрозніваючы ў будове дзяржавы ўдзел Літвы і Беларусі, усведамляюць велізарнае значэнне ў гэтай гісторыі беларускага элемента. Наогул, гэта беларусы па духу, па сваіх уяўленнях, па сваіх поглядах і паходжанні, але пісалі свае гістарычныя працы па-польску [...]. Такім жа характарам навуковага метаду вызначаюцца і працы Даніловіча, сына уніяцкага святара з Бельскага павета. Гэта быў чалавек з вельмі шырокай адукацыяй. Ён скончыў Віленскі універсітэт і заняўся выключна гісторыяй мясцовага права. Ён быў адным з вядомых прафесараў па гісторыі Літоўскага статута, па вывучэнні літоўскіх летапісаў, яму належыць выданне і тлумачэнне многіх каштоўных помнікаў нашага права. Пасля закрыцця Віленскага універсітэта Даніловіч быў пераведзены ў Харкаў, потым у Кіеў. Дарэчы, заўважым, што Даніловіч пісаў свае працы як на рускай, так і на польскай мове.

Акрамя названых асоб варта адзначыць гістарычныя працы яшчэ некаторых [...]. Асабліва шматлікія працы Адама Кіркора, прысвечаныя розным асобным пытанням беларускай гісторыі. Між іншым, Кіркору належыць шмат артыкулаў у 3-м томе «Жывапісная Расіі», выдадзенай Вольфам. Кіркор пісаў як на польскай,так і на рускай мове.

[...] Мы назвалі толькі найгалоўнейшыя імёны з вялізнай плеяды тых вучоных гісторыкаў, прававедаў, этнографаў і лінгвістаў, якія тады з вялікай карысцю працавалі над уведамленнем мінулага і часнасці роднага краю. Яны пісалі па-польску, але ў гэтым не трэба бачыць нейкую асаблівую тэндэнцыю з іх боку. Яны часам змешвалі ў сваім уяўленні этнаграфічныя і гістарычныя асаблівасці Польшчы, Беларусі і Літвы [...]. Аднак, сочачы за іх працамі, можна заўважыць, як пастулова пашыраўся іх навуковы светапогляд, і як пастулова і свядома ўжо малодшае пакаленне гэтых мясцовых вучоных пераходзіла на чыста беларускую глебу [...]. Вось чаму гэта эпоха ў сувязі са спробамі пісаць на беларускай мове з'яўляецца эпохай пачатку адраджэння беларускай нацыянальнасці і літаратуры. Гэта работа ішла паралельна з такімі ж работамі ў гісторыі іншых славянскіх народнасцей[8].

***Пытанні і заданні да дакумента:***

1. Чаму ў першай палове XIX ст. назіраўся ўздым гістарычных даследаванняў? 2. Ахарактарызуйце ўклад І.Даніловіча і А.Кіркора ў вывучэнне гістарычнага мінулага беларускага народа. 3. Чым аўтар тлумачыць той факт, што многія даследчыкі пісалі пра Беларусь і беларускі народ па-польску? Якія яшчэ прычыны вы можаце назваць?

*3. Пра дзейнасць братоў Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў*

Беларускія гісторыкі, этнографы, філолагі, фалькларысты даўно ўжо карыстаюцца пажоўклымі ад часу кнігамі — рарытэтамі і, як даследчыкі, судакранаюцца з рукапіснай спадчынай славутых вучоных Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў. Гэта яны, не зважаючы на свой высокі графскі тытул, бралі ў рукі рыдлёўкі і вялі раскопкі старажытных курганоў. Гэта яны здымалі з сябе сурдуты і апраналіся ў простае сялянскае адзенне, заходзілі ў хаты вясковай беднаты паслухаць шчырую гутарку пра побыт, даведацца пра абрады і забабоны ды запісаць народныя песні. У душы прысягнуўшы служыць свайму народу, браты Тышкевічы ніколі не адступалі ад сваіх перакананняў, шчыра працавалі на карысць роднага краю.

Праца, праца, праца… Яўстах і Кастусь замалада ўзяліся за пачэсную справу і, бадай на адным энтузіязме, заклалі трывалы падмурак навуковай археалогіі, а таксама этнаграфіі, фалькларыстыкі і краязнаўства [...]. Яны сцвярджалі ў грамадстве важную думку пра нацыянальную самабытнасць і гістарычную непаўторнасць Беларусі [...].

Шырокая натура Яўстаха Тышкевіча імкнулася да многага: ён вёў археалагічныя раскопкі, запісваў фальклор, збіраў экспанаты для будучага музея, у тым ліку гістарычныя дакументы, старажыт-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

ныя рукапісы, даследаваў этнаграфію, спрыяў ажыўленню культуры і асветы краю [...]. Да сярэдзіны XIX ст. Я.Тышкевіч сфарміраваўся ў даволі вядомага дзеяча навукі і культуры. Асабліва значэнне ён надаваў праблеме адкрыцця музея. Шмат дапамагаў яму яго старэйшы брат Канстанцін [...].

...пасля звароту ў 1852 г. братоў Тышкевічаў у паўночную сталіцу, як і меркавалася, імператарская адміністрацыя вызначыла нарэшце месца адкрыцця музея старажытнасцей — Вільню [...]. Віленскі музей старажытнасцей амаль штодня папаўняўся новымі матэрыяламі. Яны ішлі з розных куткоў Беларусі. Бяром у рукі «Уліковы каталог прадметаў...» і пераконваемся ў тым энтузіязме, з якім ахвяравальнікі даравалі сямейныя рэліквіі. Геаграфія прысланых прадметаў вельмі шырокая: Менск, Магілёў, Віцебск, Орша, Наваградак, Крэва, Ліда, Горадня, Пінск, Паставы, Браслаў...[9].

***Пытанні і заданні да дакумента:***

1. Ахарактарызуйце навуковую і грамадскую дзейнасць братоў Тышкевічаў. 2. У чым вы бачыце галоўную заслугу Канстанціна і Яўстафія? Чаму? 3. Як вы думаеце, чаму жыхары розных куткоў Беларусі ахвотна і з энтузіязмам перадавалі ў Віленскі музей старажытнасцей новыя экспанаты?

***Абагульняючае заданне да 2—3-га дакументаў:*** выкарыстоўваючы тэкст параграфа з вучэбнага дапаможніка і дадзеныя з прыведзеных вышэй дакументаў, складзіце табліцу «Развіццё беларусазнаўства ў першай палове XIX ст.»:

| Імя, прозвішча навукоўца | Уклад у развіццё навукі |
|---|---|

**Тэма "Удзел БССР у заснаванні ААН"**

***(Гісторыя Беларусі, 10 клас)***

*З выступлення старшыні беларускай дэлегацыі К. В. Кісялёва на прэс-канферэнцыі ў Сан-Францыска.*

г. Сан-Францыска, 23 мая 1945 г.

[...] Нашу першую прэс-канферэнцыю я намеціў прысвяціць азнаямленню прадстаўнікоў друку з рэспублікай, якую прадстаўляе наша дэлегацыя на канферэнцыі ў Сан-Францыска.

Беларусь — краіна з 10-мільённым насельніцтвам, знаходзіцца ў вярхоўях рэк Дняпра, Заходняй Дзвіны, Нёмана і на іх прытоках.

У многіх афіцыяльных дакументах і газетах слова «Беларусь» перакладаецца як «Уэйт Раша». Гэта няправільна [...].

Продкі беларускага народа — славянскія плямёны, дрыгавічы, радзімічы і крывічы.

Да XV і XVI ст. беларускі народ дасягнуў параўнальна высокага ўзроўню свайго сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця і стаў адным з перадавых народаў Усходняй Еўропы. У Беларусі параўнальна рана развілося кнігадрукаванне. Першая кніга надрукавана буйнейшым асветнікам беларускага народа, яго першадрукаром Георгіем Скарынам у 1517 годзе, на паўстагоддзя раней з'яўлення ў свет першай рускай друкаванай кнігі. Беларуская мова з'яўлялася агульнапрынятай дыпламатычнай мовай у беларускім княстве.

***Пытанні і заданні да дакумента:***

1. Чаму ў выступленні кіраўніка беларускай дэлегацыі К.В.Кісялёва такая вялікая ўвага нададзена гістарычнаму мінуламу Беларусі? 2. Чаму, па меркаванні К.В.Кісялёва, пераклад слова «Беларусь» у дакументах і газетах пададзены як «Уэйт Раша», няправільны? 3. Чаму для прэзентацыі Беларусі міжнароднай грамадскасці выбрана імя Ф.Скарыны? Чым можна патлумачыць, што ў выступленні К.В.Кісялёва выкарыстана імя Георгій?[10].

**Тэма «Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1990-х гг. — пачатку XXI ст.»**

***(Гісторыя Беларусі, 11 клас)***

*Фрагмент из трактата «О духе законов» французского философа XVIII в. Ш.Монтескьё*

Для гражданина политическая свобода есть душевное спокойствие, основанное на убеждении в своей безопасности. Чтобы обладать этой свободой, необходимо такое правление, при котором один гражданин может не бояться другого гражданина. Если власть законодательная и исполнительная будут соединены в одном лице или учреждении, то свободы не будет... Не будет свободы и в том случае, если судебная власть не отделена от власти законодательной и исполнительной.

***Вопросы и задания к документу:***

1.Определите, о каком принципе управления государством идет речь в данном высказывании. 2. Объясните, как данный принцип управления государством отражён в Конституции Республики Беларусь. При ответе используйте текст Основного закона[11].

**Практычны занятак** (практыкум) — форма ўрока, на якім вучні на аснове раней атрыманых ведаў і сфарміраваных уменняў вырашаюць пазнавальныя задачы, прадстаўляюць вынікі сваёй творчай дзейнасці або засвойваюць больш складаныя пазнавальныя прыёмы вывучэння мінулага. Яны скіраваныя навучыць школьнікаў прымяняць атрыманыя веды і ўменні ў новых вучэбных сітуацыях. Вылучаюцца ***тры віды*** практычных заняткаў[12]:

- *па развіцці пазнавальных уменняў,* якія звычайна праводзяцца ў тым выпадку, калі важна сфарміраваць элементарныя пазнавальныя ўменні, неабходныя для вывучэння прадмета ў цэлым або пэўнай яго тэмы (напрыклад, «Лічэнне гадоў у гісторыі» ў 5 класе);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

• *па рашэнні пазнавальных задач*, якія мэтазгодна арганізаваць для бягучага паўтарэння і практычнага выкарыстання ведаў і ўменняў вучняў;

• *па праверцы вынікаў творча-пошукавай дзейнасці*. Гэты від практыкума, як правіла, завяршае вывучэнне раздзела або нават курса і мае свой працяг у пазаўрочнай дзейнасці па прадмеце.

Як паказвае практыка, у працэсе навучання гісторыі часцей за ўсё праводзяцца практычныя заняткі другога віду — па рашэнні пазнавальных задач. Гэта абумоўлена як зместам вучэбнага матэрыялу, так і колькасцю гадзін, адведзеных на вывучэнне прадмета. Таму ўяўляецца мэтазгодным коратка разгледзець яго ***структуру***.

На першым, *арганізацыйным этапе*, паведамляецца тэма заняткаў, задачы, умовы і спосаб правядзення практыкума. У выпадку неабходнасці размяркоўваюцца ролі кансультантаў, экспертаў, кіраўнікоў груп. На *другім этапе* адбываецца рашэнне пазнавальных задач. У пачатку ёсць сэнс разабраць адну з іх калектыўна, пасля чаго вучні самастойна ці ў групах вырашаюць іншыя, пры неабходнасці звяртаюцца да кансультантаў або настаўніка. Прапануем *памятку для вучняў* «Як вырашаць пазнавальную задачу»[13]

1. Уважліва прачытайце ўмовы задання і пытанні да яго або сфармулюйце пытанні, на якія неабходна адказаць. Калі пытанне вялікае па аб'ёму, падзяліце яго на часткі.

2. Падумайце, якая інфармацыя дапамагае адказаць на пытанні.

3. Вызначыце, якіх даных не хапае для адказу і дзе іх можна знайсці.

4. Падумайце, што неабходна выканаць, каб вырашыць задачы, і вызначыце іх паслядоўнасць.

5. Прадумайце, які спосаб выканання вучэбнага дзеяння адпавядае пастаўленай задачы.

6. Выканайце ўсе вызначаныя дзеянні.

7. Растлумачце і абгрунтуйце свой адказ.

8. Праверце, наколькі ваш адказ зразумелы, правільна падабраны аргументы і зроблена тлумачэнне.

9. Пераканайцеся, што атрыманае рашэнне адпавядае пытанню.

*Трэці этап* — абмеркаванне гатовых рашэнняў. Калі вучні працавалі ў групах, то ад іх імя выступае адзін з удзельнікаў групы. Увесь клас прымае ўдзел ва ўдакладненні спосабаў рашэння і дае адказы, а эксперты аналізуюць і ацэньваюць работу груп. На *чацвёртым этапе* адбываецца падвядзенне вынікаў: настаўнік ацэньвае выніковасць заняткаў, дасягненні школьнікаў у вырашэнні пазнавальных задач, характарызуе працу кансультантаў і экспертаў, праводзіцца рэфлексія.

У завяршэнні зробленага намі агляду форм арганізацыі ўрока, на якіх пераважаюць практычныя метады навучання, адзначым, што іх выкарыстанне павінна адпавядаць мэтам і зместу вучэбнага матэрыялу, прафесійным якасцям настаўніка, пазнавальным магчымасцям школьнікаў. Урокі такіх форм не закліканы замяніць «традыцыйныя» ўрокі, а дапаўняюць вучэбна-выхаваўчы працэс і спрыяюць яго ўдасканаленню. Таму для іх неабходна адбіраць найбольш складаныя і значныя тэмы, прадстаўленне зместу якіх у падобнай форме будзе ў канчатковым выніку спрыяць яго засваенню і павышэнню эфектыўнасці адукацыйнага працэсу па прадмету.

---

[1] Подласый И.П. Педагогика: 100 вопросов — 100 ответов: учеб. пособие для вузов. М., 2004. С. 178.

[2] Там жа, с. 179.

[3] Стрелова О.Ю., Вяземский Е.Е. Формы учебных занятий по истории // Настольная книга учителя истории: 5—11 классы / авт.-сост. М.Н.Чернова. М., 2006. С. 61—62.

[4] Вяземский Е.Е., Стрелова О.Ю. Материалы курса «Как преподавать историю в современной школе: теория и методика»: лекции 5–8. М., 2006. С. 17—19.

[5] Обществоведение: учеб. пособие для 10 кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / М.И. Вишневский [идр.]; под ред. М.И. Вишневского. Минск, 2009. С. 164—165.

[6] Стрелова О. Ю., Шестаков В.А., Вяземский Е.Е. История России XX — начала XXI века. Хрестоматия-практикум // Преподавание истории в школе. 2010, № 3. С. 78—79.

[7] Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 258—263.

[8] Там жа. С. 352—354.

[9] Каханоўскі Г., Каханоўскі А. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч. Мн., 1991.

[10] Фамін В.М., Паноў С.В. Пісьмовыя крыніцы па гісторыі Беларусі другой паловы XX — пачатку XXI ст. у хрэстаматыйнай літаратуры агульнаадукацыйнай школы // Сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі. Да 1000-годдзя летапіснай Літвы: матэр. Рэсп. навук-тэар. канферэнцыі, г. Мінск, 18 снежня 2009 г. Мн., 2009. С. 230—231.

[11] Обществоведение: учеб. пособие для 9 кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / Под ред. М.И.Вишневского. Мн., 2009. С. 43.

[12] Стрелова О.Ю., Вяземский Е.Е. Формы учебных занятий по истории // Настольная книга учителя истории: 5—11 классы / авт.-сост. М.Н.Чернова. М., 2006. С. 69—70.

[13] Корзюк А.А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII—пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе: вучэб.-метад. дапаможнік / Пад рэд. докт. гіст. навук, праф. М.М.Забаўскага. 2-е выд. Мн., 2011. С. 51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ